«Podlaski Kwartalnik Kulturalny» прадстаўляе:

Пятую восень запар на łamach czasopisma «Маладосць» гасцюе «Podlaski Kwartalnik Kulturalny» («ПКК»), прадстаўляючы маладую польскую прозу, паэзію і выяўленчае мастацтва. Вялікая заслуга ў гэтай справе належыць галоўнаму рэдактару квартальніка Гжэгажу Міхалоўскаму, дзякуючы намаганням якога наш часопіс вядомы ў Польшчы, а яго чытачы знаёмяцца з новымі культурнымі набыткамі рэгіёна Падляшша. Няхай такое сяброўства працягваецца!

Вераніка Іванюк

* * *

Гжэгажу М. за выдатную
працу і далікатныя магчымасці

нашто абуджаць новы дзень
калі ён не адрозніваецца ад папярэдняга

нашто ўставаць
калі ведаеш што нідзе не дойдзем
пытаць сябе чаму (?)
і не ведаць адказу

як знайсці сэнс у нечым
што яго не мае
а можа ёсць толькі не хоча быць з табой

нашто мыць твар салёнай вадой
слёзы не дапамогуць забыць
сябе

«быць або не быць»
калі быць то для каго (?)

* * *

не паддавайся малітвам
казаў ён
вер у іх ціхенька
слоў не возьмеш назад
толькі цішыня іх змесціць

не паддавайся маім просьбам
ты так доўга мяне ведаеш
ты ж разумееш як лёгка
я саступаю малітвам

* * *

шалёны танец дрэваў
у рытм ветру і дажджу
свішча барабаніць уздыхае
свет без сораму голы бандыт
закранае пачуцці песціць
сваім ганаровым вершам
здзяйсняе шаленства
сціх
на хвіліну змоўк
знікнуў недзе за хмарай рыфмы
каб зноўку ўзнікнуць
з падвоенай сілай
надзвычайнасці
увесь лес задрыжаў ад здзіўлення
вецер заплакаў вада паднялася
і выліла з рэчышча ракі ўсе слёзы

адкуль гучыць гэтая музыка (?)
хто грае гэты канцэрт (?)
нейкі талент плача (?)
не шукаю адказу
пэўных рэчаў нельга патлумачыць
куды ж мне йсці далей
калі вецер

* * *

жанчына губляе прытомнасць
толькі на момант
а паколькі не хоча сябе турбаваць
устае нібы нічога не сталася

адно толькі можа здарыцца
тым часам
паміж уставаннем і небыццём
падраныя панчохі на калене

жанчына губляе прытомнасць
калі мае такую ахвоту
тады агаляе сантыметр шыі
або мо крыху больш
расхіляе вусны як рыба
і ўсё зразумела
няхай нават слова з вуснаў не выпала

жанчына калі губляе прытомнасць
не любіць нічога тлумачыць
тады не мусіць
ніхто не пытае
не можа

толькі яна
ледзьве кранаецца явы
і маўчыць што кахае

* * *

калі ты лавіў мае слёзы
упарта
сушыў сваім шчырым адданнем
нахабна
і сціраў з твару смутак

здаралася што
пад уплывам тых ціхіх абяцанняў
уздымалася новая ўсмешка

ты збіраў кожную кроплю
часам падымаў яе з зямлі
сквапна пераліваў ва ўсё
большыя судзіны

і гэтак мора стала салёным

* * *

жанчына з цыяністымі вачмі
якая шторанку крадзеш
расу з-пад майго люстра вады
жанчына з распушчанымі
крумкачынымі валасамі ў якіх гнёзды
уюць мае птушкі
жанчына шнупар
гэта я твой цень
перагрызаю лінію жыцця
дазваляю табе адысці

* * *

пакідаю цені продкаў
не ствараю аніякай гісторыі

я ўжо і не пачатак і не канец
я не звяно тваіх успамінаў
я ўжо не вусень
і перастала быць матыльком
толькі ўсяго на хвілінку

я была шрамам на тваёй губе
прыкметным толькі тады
калі ты з'едліва яе прачыняў
каб маліцца да іншай

крылы перасталі быць практычнымі

а зараз я глядач
узіраюся як ты шукаеш мае далоні
слухаю як тужыш па слове ў лістах
як прыгожа губляеш цела ў пасцелі
чакаю

чакаю ажно ты зноўку дарасцеш
да маіх плячэй

Пераклад з польскай Кацярыны Канчэўскай

Катажына Саўчук

невясельная песня

нашы целы з аднаго цеста
з жытняй мукі на заквасцы
калі мы спяваем нашы ўкраінскія песні

нашы душы па вобразе і падабенстве
нашых хахляцкіх продкаў
выстаўленыя на выпрабаванне часам

мы маем уласную мову
і скуль мы знаем патаемныя намеры
нам абаім вядомыя

але ж ты выпіў віна з жанчынай
якая не разумее нашых звычаяў
блытае іх са сваімі

цяпер вы ў адзіным целе
а палова гэтага цела мела быць мне
а палова гэтага цела мелася быць маёй

хлебам скрадзеным накармі мяне
віном салодкім напаі мяне
бо не змагу танчыць на вяселлі тваім
калі заспяваюць не нашы песні

* * *

пярун ударыў уранку

ўвесь век яна ўставала на дасвецці
трэба было распаліць вогнішча
падаіць карову
зварыць кашу

увесну чакалі Пасху
лета пахла пакосам
увосень капалі бульбу
узімку ткалі дываны на кроснах

хапала работы
жыў чалавек
у вёсцы людзей было многа
спявалі
хадзілі ў царкву
хавалі дзяцей
зараблялі капейчыну
спаць не было калі
чалавек усяго дасягнуў
сваімі рукамі
з Божай помаччу

а цяпер старасць
самота бясконцая
дзеці правялі тэлефон
але не звоняць
цела не слухаецца
вочы не бачаць
ногі не ходзяць
дый няма куды
хіба што на могілкі
маладыя не зразумеюць
сядзіш дома
устанеш уранку каб агонь распаліць
зварыш кашу
заспяваеш Госпадзі, памілуй
а смерці няма

пярун ударыў уранку
распаліў агонь
у маёй хаце

ныне отпущаюши раба Твоего, Владыко
цяпер дазволь адысці служцы тваёй, Божа

аб наканаванні

памяці Надзеі і Пятра

мы пазнаёміліся на тыдзень раней
чым былі наканаваныя адно аднаму
давялося хутка мяняць планы

уцякаць ад сябе

не цяпер яшчэ не цяпер

мы шмат падарожнічалі
але ж чаму са столькіх гарадоў свету
ты выбраў той што і я
і мы зноў сустрэліся раней
чым планавалася

*

некалі я ведала пажылую па́ру
яны ажаніліся на тыдзень раней
і гэта іх уратавала ад расстання
калі прыйшоў загад аб высяленні
у іх ужо быў агульны дарожны клунак

каханне бывае практычным

гэта вельмі старая гісторыя
дзякуючы якой я не веру ў наканаванне

час збіраць камяні

здараецца выходжу з цягніка
на прамежнай станцыі
каб аддыхацца

пакідаю рэчы ў вагоне
прашу кагосьці прыглядзець за імі
цягнік ад'язджае

і мне лягчэй
на хвілю я не павінна задумвацца
хто я

*

стагоддзе таму цягнікі везлі іх на ўсход
за Ўрал, на Каўказ, на Байкал
пасля вайны цягнікі везлі іх на захад
у Вармію, Мазуры, Сілезію, на Памор'е,
а яны ў клунках везлі шкарлупіны свайго свету
які насамрэч не скончыўся
калі яны ехалі ў невядомасць

у вышытае песняй і малітвай льняное палатно
закручвалі кавалак сухога жытняга хлеба
а пасля не засталося й хлеба
хавалі загінулых у чужой зямлі
а дзеці іхнія не ведалі спадчыны

але ж я ёсць, бо яны вярнуліся
вярнуліся, але ўсё было іншым

*

шчаслівыя тыя, якія могуць не бачыць
хто яны ёсць

воўк і авечка

у слове тваім — сіла закляцця
можаш узвесці касцёл
можаш яго зруйнаваць
і ніколі не аднавіць

у руках тваіх — сіла прарока
можаш ацаляць нямоглых
можаш ідучы па вадзе патапіць карабель
а потым на беразе хлеб раздаваць жабракам

наколькі моцная твая малітва?

твае ка́зані ўжо мала што значаць для мяне.

ты згубіў сваю авечку, ойча,
і не шукаеш мяне

згода?
ты не падае́ш рукі

я згодна з гэтым

Пераклад з польскай
Алеся Емяльянава-Шыловіча

Яанна Савіцка

* * *

кабета гэтага стагоддзя
абувае васьмісантыметровыя шпількі
грацыёзна дэфілюе па вальеры
яе закідваюць
прыгаршчамі кампліментаў
прыгаршчамі мацюкоў
прыгаршчамі добрых парадаў

кабета гэтага стагоддзя
самотная дома здымае
абутак з высокім абцасам
вешае маску на вешалку
паліто кладзе побач са шпількамі

кабета плача
самотна цэдзіць каву
(абавязкова з двума лыжкамі лёду)
пад гучную калатнечу палітыкаў па ТВ
а перад сном
шукае ў інтэрнэце
чуласць
дотык
вуснаў смак

кабета гэтага стагоддзя
прымае снатворнае
і захінаецца ў коўдру
каб
не
скалець

* * *

калі ты шчаслівы
вершы не пішуцца
у дваццаць першым стагоддзі
пісаць пра хмары і асалоды
забараняецца

хто сумуе па шчасці
развітваецца са славай
застаецца ў куце падраны
і пашкуматаны
як у вулічных бойках
пабіты сабака

пануе ў маім свеце
благастан
тут ёсць і дрэва і сонца
і ўсмешка
ў каштанавай
шафе
з дрэва?
а можа пластыку?

мяне не хвалююць:
сваркі па тэлебачанні
недакончаныя фільмы
нявысветленыя размовы
і бясконцыя стагнанні

ёсць я
і хвіля рэлаксу

прафанацыя

дрэвы ў квецені атулілі брыдкую кабету
чорныя ніжэй плячэй валасы
захінулі твар

калі Ісус памёр не дакрануўся
ейнай шчакі далонню
яна засталася адна сярод людзей
каля крыжа

Пілат паціраў рукі

Пётр Кавескі. «Баршчэўнік».

*

хто без граху
хай першы кіне камень

усе паглядалі на яе левую смочку
якая вызірнула з сукенкі
яна была вялікай
мужчыны кінулі жанок
узбудзіліся
маўчалі

Ісус выняў пластыкавую місу
яна абмыла ягоныя ногі

відаць яна разважала колькі народзіць яму дзяцей
а ён самотна памёр на крыжы

* * *

шчасце — гэта матылёк
з ягоных крылцаў асыпаецца пылок
матылёк ледзь бачны
затуманенымі вачыма
шчасце? імгненне
якое можа падарыць усё
і яшчэ хутчэй зробіць жывой
усмешку
шчасце — няўлоўнае
стракатае і прыўкраснейшае зверанятка
але шчасце адлятае вельмі рана
шчасце вельмі рана ўцякае

…бо шчасце
ўсяго толькі шчасце
імгненне жыцця

Пераклад з польскай
Алеся Емяльянава-Шыловіча

Вальдэмар Міхальскі

Ліст да брата Альберта

Ва ўсёй кнізе — адна думка:
«быць добрым, як хлеб» — хапае,
каб жыццё прайшло не марна.

Час для гадзіннікаў роўны:
учора, цяпер — белы стол і бохан,
як сонца, падзелім на лусты.

Што маю — Тваё.
Уздасца мне — бо даваў.
Клічу: «Ойча!», нехта ў адказ мне: «Тут я».

Мы ходзім той самай сцежкай,
адчыняем тую ж знаёмую браму.
Шукаем ежу?

Браце Альберце з паштовай маркі,
не цурайся драўляных парогаў
нашых сэрцаў.

Найвялікшая нічыя ў гэтым свеце

прафесару Уладзіміру Седлакову

Ля хаты зноўку паявіліся птахі,
якіх заўсёды праганялі нават
з біблейскіх спеваў.

Вунь той залюляў сухую амаль што
таполю і жыў аднавокі
ў гняздзе, спаленым вапнай.

І вось чалавек з'явіўся апоўдні,
вуду меў, проса ў кішэні,
не прагнуў падтрымкі, быў проста цярплівым.

Найвялікшая нічыя ў гэтым свеце —
пачуўся голас знанага прафесара.
Не паспеў азірнуцца — за акном няма птаха.



На байдарцы па Днястру

Россып бляклых фотаздымкаў,
на стале рака віруе.

Гладзь вады ўзаралі вёслы
і крыла два белай чайкі.

Неба супраць, але з Богам!
З чуйным сэрцам, зоркім вокам.

Дзівіць часу напісанне
ў белых цэрквах чорных земляў.

З дрэва стол, сцяны чатыры,
а Святая Тройца — пятай.

Плынь рачная ў даль панесла.
На вадзе сляды застылі.

Пілігрымка ў Пачаеў

Адсюль Пачаеў
быццам на далоні.
Удыхаеш дым кадзільны,
мацыёлу і расходнік.
Вежа сягае неба.
Толькі неба
без дыхання,
без пачатку,
з перакрэсленым крыжам
на векі вечныя.
А ў торбе —
засуха.

Белая чайка

Памяці сына Януша —
аўтара кнігі «Воднымі шляхамі
Польшчы, Літвы, Украіны»[1]

Чайка белая, адкуль ты
за маім акном, красуня?
Спакаваныя палаткі.
Плынь шалее — рве з рук вёслы.

Хто на беразе застаўся —
той чужак, не бачыць злева
Найсвяцейшай Тройцы вежу,
срэбнай рэчкі браму ў доле.

Чайка белая, адкуль ты
ў кожным слове так чаканым?
Знак даеш у шлях збірацца
ці для сэрца весціш раны?

На стале чарговы адрас,
дзён разбіўка на этапы,
мера рэчаў — белы аркуш,
зноў спісаны ўвесь дарэшты.

Чайка белая, адкуль ты —
з Прыпяці, з Днястра? Раскрый мне
словаў сэнс, што мне прынесла,
зноў вярнуўшыся, як хваля.

Пётр Кавескі. «Чартапалох лекавы».

Primavera[2]

Галерэя Баргезэ сніцца кожнай ноччу:
удваіх абягаем Рыма фантаны.
Не бойся мяне. Я — як сабака,
утароплены ў бурбалку з мыла.
Хлушу, нібыта да гэтага часу кахаю.

Будзімся ранкам галодныя. Праз драўляныя жалюзі
прабіваецца сонца — прамяністае, адпачыўшае,
як заўжды, як ні ў чым не бывала.
Боскім каўчэгам плывуць твае плечы,
сэрца ўнутры — з алебастру.

Што шчасце толькі ўдваіх здабываюць,
нат дурні чулі — абраныя знаюць.

Усё ўнутры нас

Шлях, дзе сосны з глогам змяшаліся разам
і бягуць да пракосаў свежай травы,
што лашчыцца да ног,
а сабака вядзе да крынічнай вады —
гэта моцная, пададзеная з надзеяй далонь
і заселыя ў горле на паўслове пытанні:
Што ёсць праўда і ці ёсць каханне?

Войны ўсе — блазнаванне, а ўсе заклінанні,
быццам проба агнём альбо камень на шыі.
Хто не любіць, той страху не мае,
хто не плакаў, радасць таго ніколі не ўзрушыць:
чарнее каляндар на ростані дарог.
Толькі зоры над намі,
толькі вера ўнутры нас.

Пераклад з польскай Анатоля Брусевіча

---

[1] Маецца на ўвазе кніга Януша Міхальскага (1962—2006) «Wodami Polski, Litwy i Ukrainy: reportaże i wspomnienia.» — Lublin: Związek Literatów Polskich, Wydawnictwo Bestprint, 2007. — 232 s.
[2] Primavera (італ.) — вясна.

Аляксандр Юркевіч

Малітва

Прашу аб сіле,
каб мог бараніць слабейшых.
Прашу аб мудрасці,
каб слова маё
было справядлівым.
Прашу аб мужнасці,
каб супрацьстаяць усякім
нягодам.
Прашу аб нязломнасці,
каб трываць тое,
дзеля чаго створаны.
Прашу аб светлым розуме,
каб не быць зноў ашуканым.
Пане, усё, што раблю,
раблю для Цябе.
Не пакіну Цябе ніколі,
бо ў Табе мая моц.
Скіроўвай ногі мае, каб крочылі
Табой абранымі сцежкамі.
Скіроўвай рукі мае,
каб служылі дабру і справядлівасці.

In nomine Patris
et Filii et Spiritus Sancti[3]

Хвароба

Пульс у норме,
ціск таксама,
рытм працы сэрца рэгулярны,
ніякіх тромбаў,
клапаны функцыянуюць нармальна —
дык у чым праблема?

адказ вядомы — жанчына.

Крывое люстэрка

Усміхаюся,
назіраючы прагу свету
да самазнішчэння,
усміхаюся,
калі ўсюды пануе зло,
усміхаюся,
бо педафілы і забойцы
сноўдаюць па зямлі.
Смутна мне,
калі няма жаднай вайны,
калі людзі не гінуць тысячамі,
смутна мне,
калі птушкі спяваюць,
калі ўсюды толькі любоў,
воля, свабода.
Ды, заўважце, я дагары нагамі
стаю, як і цэлы свет…

Выклік

Не заслужыў я,
не заслужыў я на лёс,
падрыхтаваны Богам.
Можа быць, гэта слабасць?

К чорту коціцца свет:
здрада, падман, пагарда
людзей да іншых людзей...

[3] У імя Айца, і Сына, і Святога Духа (лац.).

Творцу не патрэбны авечкі
з іх паслухмянай пакорай,
яму патрэбна ваўкоў
цэлая зграя,
што навядзе парадак
там, дзе неабходна.

Толькі дзе іх знайсці,
калі ўсюды аслы і авечкі?

Ці ведаеш, чый голас
гаворыць пра адсутнасць шанцаў
і ў адначассе раіць не здавацца,
кажа, што загінеш,
а праз хвіліну, што ты бессмяротны?

Ён твой.
Бо ты ствараеш межы і бязмежжа.
Усё залежыць ад цябе.
Дык стань ваўком,
ратуй гэты свет!

Сізіфава змаганне

Найбольш моцнае пачуццё —
нянавісць.

Думаў заўсёды, што каханне,
але не, гэта няпраўда.
Столькі ж мае моцы, калі можа прывесці да вайны,
смерці мільёнаў,
скрэсліць кожны маральны прынцып!

Некаторым здаецца, нянавісць можна зацугляць,
асядлаць
і стрыножыць.

Усё брахня!
Калі гэтая гніль засядзе ў табе, то хутка
пачне знішчаць,
выядаць знутры —
не справішся з ёй.

Павер мне, я спрабаваў.
Дагэтуль спрабую...

яшчэ адзін урок

Маска...
Ненавіджу маску...
Зрэшты, чуюся ў ёй лепей, чым ва ўласным «я».
Усё радзей яе здымаю,
без яе мне цяжка,
ды часовая палёгка выйсцем быць не можа.
Бо жыццё такое — жыцца мусіць цяжка.
Цяжкасці фармуюць нас і наш характар,
чэрпаем з іх досвед,
і ад нас залежыць,
што мы з гэтым зробім.

задзяўбалі штампы...

Крызіс веры

Дзе ты?
Тата б'е маму,
крычыць на яе, штурхае.
Дзеці глядзяць.

Дзе ты?
Трое мужчын гвалцяць
дзяўчынку-падлетка.
Людзі глядзяць.

Дзе ты?
Катуюць тваіх паслядоўцаў,
увекавечваюць гэты здзек.
Ты глядзіш.

Дзе ты?
Вакол нас? Недзе побач? На небе?

Цікава,
спецыяльна так робіш,
што крызіс веры тады надыходзіць,
калі найбольш яе патрабуем?

А ты, і праўда, каварны.
Усё часцей забываю,
што мераеш справядліва,
хоць часта твае прысуды
мне зразумець немагчыма.

І таму ты з'яўляешся Богам,
а не я ...

Пераклад з польскай Анатоля Брусевіча

Марцін Даніэль Кавальчык

* * *

блукаць па дзікім садзе
з каліўцам сонца ў сэрцы

з белым круком на плячы

ванну прымаць у возеры нектару
меданосных траў

першыя пацалункі дарыць
закаханым

закружыцца ў містычным танцы
з каралевай ночы

заўсёды мець над галавой
акрайчык аксамітнага блакіту

не губляць сябе…

прэлюдыя кахання

ад яго не вылечыць
лыжка мікстуры

гэта не прастуда

калі захопіць хвалюючымі акордамі
заглушыць рэальнасць

завядзе ў райскі сад
пачастуе сочнымі пацалункамі

разгушкае арэлі асалоды

раптоўна парве
гаручую струну сэрца
напружаную гукамі захаплення

пырсне жар любоўнай Аркадыі

засквірчыць у прыску
патыхаючы слязою смутку

а гэта толькі прэлюдыя

перш чым нявінныя вочы дзіцяці
прымружаць стомленыя павекі

партрэт у люстры

у люстэрку перад якім
ты ў задуменні расчэсвала
свае залатыя валасы
бачу скрозь
адбітак анёльскай прыгажосці…

у ім застаўся
развітальны след
кармінавых вуснаў…

залатыя валасы
распушчаныя на плячах
ззяюць як німб…

кіруюся…

з вераю

сціскаю ў пальцах
боскую ніць любові

калі на хвілю выпускаю яе
з голасам сэрца знітоўваю думкі

не дазволю сумненню
падрэзаць мне
крылы

плыву з павевам
душэўнага ветру…

у неба

паляванне каханкаў

сустрэнемся над рэчкай
вячыстых адчуванняў

як толькі начны паляўнічы
спусціць з прывязі
галоднае святло рамантызму

пусцім па шырокай плыні
у доўгачаканае плаванне
карабельчыкі з лістоў
напісаных шалёным каханнем

злучым назаўсёды
ссумаваныя берагі
нашых сэрцаў

дамо захінуць сябе вэлюмам
страшнай таямніцы
сястры начнога паляўнічага

ад холаду жыцця
нас абароніць
пяшчотнае цяпло
нашых позіркаў…

Пётр Кавескі. «Вятрак».

Пераклад з польскай Алеся Емяльянава-Шыловіча

Вераніка Лапацка

нарадзілася ў 2004 годзе ў Міжрэччы Падляскім. Лаўрэат агульнапольскага літаратурнага конкурсу для дзяцей і юнацтва імя Марыі Канапніцкай (2017). Трынаццацігадовая аўтарка захапляецца гісторыяй Другой сусветнай вайны, літаратурай і верхавой яздой. Дэбютуе адначасова ў двух выданнях — «Падляскім квартальніку культурным» і «Маладосці».

Пах крыві

лета 1939

Цёплыя промні сонца разагравалі Варшаву — і яна абуджалася да жыцця. На вуліцах можна было заўважыць усмешлівыя тварыкі дзяцей і матуль, якія выходзілі разам з крам са школьнымі прыладамі. Неўзабаве пачынаўся новы навучальны год. Духмянасць цёплых булак з пякарні і павольнае перасоўванне мінакоў сведчыла, як тут усім павінна быць хораша. Толькі адна дзяўчына з доўгай светлай касой на плячы ляцела на злом галавы, чапляючы мінакоў. Яна не глядзела, на каго трапляе, бо ўжо моцна спазнялася. Урэшце дабралася да вялікай будыніны. Калі наблізілася, сабакі ў клетках нібы абудзіліся да жыцця і віталі яе характэрным брэхам. Яна адчыніла дзверы, не звярнуўшы ўвагі на тое, што ледзь не прыціснула нос аднаму з валанцёраў прытулку. Дзяўчына заляцела ў гардэроб і накінула на сябе цёмна-сіні фартух з вышытай на грудзях выявай сабакі. Бегма выскачыла адтуль і апынулася ў памяшканні, дзе адбываўся сход валанцёраў. Яна ўселася ў канец вялікага стала, за якім сабралася каля сарака чалавек.

— Як я і казаў, мы хочам падрыхтаваць дадатковыя клеткі на тэрыторыі прытулку, — дырэктар глядзеў з дакорам на спозненую Малгажату. — Акрамя таго, будзе ўладкаваны дадатковы пакой адпачынку для шчанюкоў — дзесьці на пачатку верасня. Той, хто спазніўся, будзе мець праблемы з інфармацыяй. На гэтым усё, бывайце, — мужчына кінуў зялёную папку перад Госяй і выйшаў, мармычучы сабе пад нос штосьці пра пашырэнне прытулку.

Дзяўчына разгарнула папку з адпаведнымі дакументамі. Але адразу ж адсунула яе і падышла да акна. Яна заўважыла кабету, якая забірала шчанюка. Малгажата ўсміхнулася думцы пра тое, што чакае яе праз тры дні. Было дваццаць восьмае жніўня, а яна яшчэ не мела ўяўлення, як будзе выглядаць далей яе праца ў дабрачыннай арганізацыі. Дзяўчына збегла па сходах уніз, зняла фартух і ўціснула яго ў шафку паміж кніжкамі. Выйшла з будынка і падышла да свайго любімчыка. Штурхнула металічныя краты і ўвайшла ў «дом» мяшанца — каўказскай аўчаркі. Села на мокрую, цвёрдую зямлю і пагладзіла сабаку, які адразу ж паклаў галаву ёй на калені. Хоць ён і быў яе любімчыкам, але яна душы не чула і ва ўсіх астатніх ста пяцідзесяці сабаках, у тым ліку і чатырох з пароды дынга. Ніхто не высвятляў, з якога заапарка тыя ўцяклі, але адно было вядома дакладна: гэта былі адзіныя такія сабакі ў варшаўскім прытулку.

З задумення Малгажату вывеў ліпкі язык сабакі, які выкручваў кругі на чуллівай скуры шаснаццацігадовай дзяўчыны. Яна апрытомнела і пакінула клетку, замкнуўшы яе так, як рабіла гэта штодня.

Дзяўчына выйшла праз браму і накіравалася дадому. Сёння ў яе ўжо не было аніякай працы; яна ведала, што пасля такога выпадку не варта вяртацца. Некалькі спазненняў было для дырэктара таварыства сігналам: *ты больш тут не працуеш*. Малгажата сама не ведала, ці плакаць ёй, ці радавацца. На твары мужчыны было напісана, што яна часова пазбаўлена службовых паўнамоцтваў і абавязкаў. Ён кожнаму так тлумачыў перад звальненнем, а яна як-ніяк перабрала меру.

Дзяўчына нават не заўважыла, як хутка апынулася ля дома. Адамкнула нязменна рыпучыя дзверы. Падалася да пакоя, у якім перад выхадам яшчэ струменіла аптымістычны погляд на свет. Грузная сучка прывітала дзяўчыну, лізнуўшы ў твар, і адразу ж за ёй у пакой прыклыпала пяцёрка пяцімесячных шчанюкоў. Малгажата паклала ўсіх на тапчан і пачала чухаць за вушкамі. Яна дасканала ведала іх звычкі. Мела «бзік» на аўчарках, асабліва падгалянскіх. Белыя шарыкі качаліся па мяккай паверхні, абнюхваючы адно аднаго і дзяўчыну. Яны грызлі яе пальцы і кусалі за шыю. Такія забавы каштавалі дзяўчыне мноства шнараў, струпаў і рубцоў. Але гэта прыносіла ёй уцеху. Можна сказаць, што жывёлы яе выхавалі. Дзякуючы гэтаму Гося і ведала так добра іх звычкі.

Наступныя тры дні праляцелі маланкай. Малгажата не паспела і вокам міргнуць, як ужо трэба было прыдумляць перад люстэркам якую-небудзь прычоску. Урэшце яна вырашыла, што запляце дзве касы. Задаволеная, схапіла кнігу і адправілася на пачатак школьнага года. Штосьці ўнутры аднак падказвала ёй, што не трэба ісці, што яна мусіць дзесьці схавацца. Дзяўчына нават сварылася на сябе ў думках.

Малгажата выйшла на вуліцу, якая пульсавала жыццём. Тут жа перад крамай агародніны яна павінна была сустрэцца з братам. Ён чакаў, як заўсёды, ужо пяць хвілін. Гося адшукала брата вачыма і рушыла наўпрост да яго. Але тут зірнула на тратуар, з якога раптоўна знік яе цень. У адно імгненне зрабілася цёмна, а неба пакрылі дзясяткі крылатых машын. Першыя выбухі выклікалі вялікую мітусню. Напалоханыя людзі ў паніцы ўцякалі. Чарговыя снарады падалі з неба, як кроплі дажджу. Себасцьян (брат Малгажаты) схапіў яе за руку, і яны хутка пабеглі дадому. Забеглі ў кватэру і пачалі пакаваць у чамаданы самыя небходныя рэчы.

— Дзеці, гэта бамбардыроўка! — перапалоханая маці таксама складвала тое, што магло спатрэбіцца. Праз дзве хвіліны яны закрылі свае чамаданы. Малгося паклала ў кошык і шчанюкоў, якія трэсліся ад страху. Прывязала да іх маці павадок — і яны пакінулі дом. Разам падаліся на чыгуначную станцыю: там панаваў тлум; людзі працiскаліся наперад і душылі адно аднаго. Праз свіст кандуктараў можна было разабраць, што ўсе рэйсы адменены. Нягледзячы на гэта, людзі станавіліся ў даўжэзныя чэргі да білетных кас.

— Мама! Што мы робім? — пытанне Госі перарваў чарговы выбух. Жанчына не здолела адказаць. Гэты раз снарад прызямліўся на станцыю. Ашаломленыя людзі спатыкаліся аб целы забітых і яшчэ жывых. Малгажата схапіла кошык са шчанюкамі і дапамагла маці падняцца.

— Дзе Себасцьян? — жанчына спрабавала перакрычаць чарговыя выбухі. Дзяўчына пачала аглядацца ў пошуках брата. Перад яе вачыма прамільгнуў яго гранатавы пінжак, які нехта ў яго забраў. На кучы друзу і паваленых слупоў ляжаў ужо нежывы Себасцьян.

— Себасцьян! — залямантавала Малгажата і падбегла да яго. Прыўзняла яго галаву.

— Сынку! Прачніся, не пакідай нас, калі ласка, — маці туліла акрываўленае цела да грудзей і цалавала яго ў лоб.

— Себасцьяне, малю цябе! — прытуляючы і калыхаючы сына, крычала ўсё яна. Смерць свайго дзіцяці горшая за ўласную смерць. Хто не прайшоў праз такое, не ведае, што гэта значыць.

— Гэта маё дзіця! — крычала жанчына ў роспачы. Яе любы сын, якога яна столькі чакала, быў жорстка забіты ў першы дзень вайны.

Яны вярталіся разам, ледзь перастаўляючы ногі, — да дома, ад якога нешта яшчэ засталося. На вуліцах панавала пустэча, хаця акурат цяпер павінны былі вяртацца са школы дзеці — у форме, з ранцамі. Паловы Варшавы ўжо не існавала. Цяпер пачыналася іншае жыццё — жыццё ў пастаяннай няпэўнасці і страху. Раптоўна, ні з таго ні з сяго, Малгося ўспомніла пра прытулак. Напэўна, ад яго ўжо нічога не засталося! Яна аддала свой чамадан маці, вырвала з яе рук падгалянскую аўчарку і пабегла ў кірунку разбітай снарадамі варшаўскага «прыстанку» для жывёл. Дарога была кароткая. Галоўнай алеяй можна было дабрацца як найхутчэй; потым збочыць направа — і ты ўжо фактычна на месцы. Гося не ішла, яна імчалася.

Прытулак не нагадваў былы «прыстанак». Будынак быў разбіты. Адзінкавыя жывёлкі бегалі агаломшаныя. Большасць сабачых цел бязвольна ляжала ў клетках альбо па-за імі. Са ста пяцідзесяці выжылі толькі дваццаць. Унутры будынка, які цудам яшчэ стаяў, ляжалі дзесяць мёртвых валанцёраў. Малгажата падышла да клеткі, дзе знаходзіўся яе любімчык Бамба (каўказская аўчарка). Ён яшчэ жыў. І быў у шоку. Яна выпусціла сабаку з клеткі і тое ж зрабіла з іншымі. Усе паслухмяна накіраваліся за ёю. Яны ўвайшлі ў падвал, дзе стаялі досыць вялікія старыя клеткі. Іх было каля трыццаці. У кожную з іх дзяўчына запусціла аднаго сабаку. Шчанюкі адправіліся ў клетку з маткай. Гося дастала аднаго з іх.

— Люблю вас усіх, — нахіліла яна сваю галаву да пысы шчанюка. Пацерла рукой шчаку, па якой цяклі слёзы, пацалавала мілую аўчарку і аддала яе маці. Замкнула клетку і выйшла з разваленага будынка. Яна не была ўпэўнена, што да заўтра тут штосьці яшчэ застанецца.

вясна 1943

Колькі дзён добрае надвор'е не пакідала Варшаву. Сонца падпякала дзіцячыя тварыкі. Аднак выкупаныя ў красавіцкім сонцы дрэвы былі сведкамі трагедыі, якая кранула Польшчу.

Малгажата была ўжо дарослай дзяўчынай. Яна вельмі шмат страціла ў гэтай вайне: бацьку, брата, некалькі блізкіх людзей. Маці сядзела цэлымі днямі дома. Яна не ведала, ці скончыцца ўрэшце гэта пекла, ці ёй таксама наканавана памерці ў пакутах і болі. Яна мела толькі любімую дачку, за якую штодня хвалявалася. Жанчына выглядвала праз акно, праводзіла яе вачыма, калі тая выходзіла. Вось і цяпер стаяла і прыглядалася. Яна ведала, што дачка ідзе ў прытулак, як ведала і тое, што там яе можа напаткаць смерць.

— Здарова! — спыніў Малгосю на вуліцы прыяцель.

— Ты дурны! Не тут! — шапнула тая, цягнучы яго ў завулак. — Колькі атрымалася? — Гося ўвесь час мела ў галаве тысячы думак і ніяк не магла цалкам сабрацца.

— Сёння ўначы прыедзе каля дзесяці, — Янэк выпраменьваў на дзіва аптымістычнае стаўленне да жыцця.

— Добра, буду чакаць іх у прытулку, — адказала дзяўчына, пасля чаго рушыла ў напрамку «прыстанку».

Знерваваная, яна грызла пазногці. Не заўважыла, як з кончыкаў пальцаў пачала капаць кроў. Капала на тратуар, пакідаючы маленькія кропелькі чырвонай «расы». Праз хвіліну Малгажата пабачыла бляск аўтамабільных фар. Чарговы раз яна ўважліва агледзелася навокал. Вялікі грузавік прыпаркаваўся ля апусцелых клетак. На сядзенні кіроўцы знаходзіўся Янэк, а побач з ім хлопец, што дапамог яму з пропускам на ўезд і выезд з гета.



Малюнак Аркадыуша Саўчука

— Ну як, пуста?— Янэк яшчэ раз хацеў упэўніцца ў тым, што нікога няма.

Малгося кіўнула. Янэк стукнуў чатыры разы па грузавіку, даючы знак, што можна выходзіць. Пяцёра дарослых людзей абтрэсліся ад смецця, якое перавозіла машына, і выскачыла вонкі. Яны падбеглі да дзяўчыны — яна паказала ім далейшы напрамак. Янэк дастаў з-за сядзенняў хлопчыка, які мог мець дзесьці каля годзіка, чатырохгадовую дзяўчынку і сямігадовага хлопца. Ён узяў у свае здранцвелыя рукі малечу і правёў усіх да Малгосі. Дзяўчына завяла іх у будынак. Янэк адышоў да грузавіка і выдаў характэрны ціхі свіст. Двое яго аднагодкаў адчынілі дзверы багажніка і пабеглі за астатнімі. Янэк зачыніў з трэскам багажнік, пасля чаго пайшоў дапамагаць дзяўчыне, якая рашылася схаваць дзесяць яўрэяў, вывезеных з гета.

— Паслухайце, удзень, гадзіне а дванаццатай, немцы звычайна патрулююць нашу вуліцу. Рэдка здараецца, што яны заглядваюць сюды, таму

зранку сядзіце ціха. Уначы за мурам бяспечна. Штодня я выпускаю сабак пабегаць. Па іх брэху вы будзеце ведаць, ці можна выйсці наверх альбо вонкі, — акрэслівала Малгажата правілы іх новага існавання.

— Апроч таго, мы аформім вам якія-небудзь дакументы. Пажывяце тут, пакуль мы не знойдзем нейкае іншае выйсце, — дадаў Янэк.

Яўрэі моўчкі кіўнулі, беручы толькі што атрыманыя матрацы, пледы і падушкі. Яны ляглі ў вялікія клеткі. Малгажата замкнула за сабой дзверы і падалася прыступкамі ўгару.

Зірнула на старое фартэпіяна. Усміхнулася сама сабе і ўселася на табурэт. Паклала пальцы на клавішы інструмента і ціхенька зайграла песеньку «Хрызантэмы залацістыя». Гэтая мелодыя заўсёды яе супакойвала, суцішала. Парны памер, а потым — няпарны. Яна калыхалася ў рытм мелодыі.

— Малгося? — высунуўся з-за дзвярэй Янэк, пачуўшы прыгожую музыку. Дзяўчына абярнулася. Яна заклапочана зірнула на яго і перастала граць. — Ты заначуеш тут? Калі які-небудзь фрыц прыедзе сюды, то перастраляе іх, як качак, — маляваў ён ёй жахлівы канец.

— Ведаю! — Гося ўстала з табурэта і зайшла ў падвал. Яна глядзела, як корпаюцца дзеці. — Янэк, прывязі мне яшчэ дваццаць, — шапнула яна хлопцу, які стаяў на сходах.

— Ты ашалела? Хочаш схаваць тут трыццаць яўрэяў?

— Я не прашу цябе! Я табе загадваю! Заўтра чакаю транспарт, — адрэзала дзяўчына, пасля чаго вярнулася наверх. Яна лягла на кушэтку і прыкрылася коўдрай.

лета 1943

Янэк ішоў жвавым крокам. Азірнуўся, ці не ідзе хто за ім. На калідоры збочыў управа і загрукаў у дзверы кабінета.

— Guten Morgen (Добры дзень), — сказаў Янэк, уваходзячы ў пакой і шчыльна зачыняючы дзверы.

— Morgen, — адказаў эсэсавец ля стала. — Hast du etwas für mich? (У цябе ёсць нешта для мяне?) — Немец падазрона глядзеў на хлопца.

— In einer verlassenen Zuflucht versteckt man Juden (У пакінутым прытулку хаваюць жыдоў), — раскрыў Янэк тайну Малгажаты.

— Also fahren wir schon (Ну, тады едзем), — эсэсавец паспешліва падняўся з крэсла і выйшаў.

Яны разам селі ў фургон і рушылі ў вызначаным Янкам напрамку. Дарога была досыць кароткая. Хлопец выдыхнуў, бо было падобна да таго, што Малгажата ў будынку. Ён правёў немца з яго таварышамі за дзверы. Малгажату ўжо папярэдзілі пра прыезд «гасцей», бо псы брахалі і вылі ў клетках, перасцерагаючы аб іх прыбыцці. Адзін удар у дзверы — і гестапаўцы апынуліся ў прытулку. Потым забег у падвал, дзе Малгажата акурат замыкала металічныя краты.

— Gehen wir los! (Хадзем!) — эсэсавец ірвануў дзяўчыну ў бок дзвярэй. Астатнія адамкнулі краты і выгналі жыдоў вонкі. Паставілі ўсіх каля сцяны. Малгажата глядзела наўпрост у вочы здрадніка. Зірнула яшчэ раз на прытулак і ўсміхнулася.

— Зараз гэта скончыцца, — упэўніла яна ціха хлопчыка-яўрэя, што трымаў яе за руку.

Найбольш ёй было шкада маці. Малгажата не мела ўяўлення, як тая зрэагуе на паведамленне пра яе смерць. Засталася толькі надзея, што маці як надаўжэй пра гэта не даведаецца. Позірк дзяўчыны застыў на твары Янкі. І ў той жа момант прагучаў блізкі свіст снарадаў. Малгажата заплюшчыла вочы. Праз хвіліну яна адчула, як па целе разыходзіцца холад. Дзяўчына бязвольна ўпала на заліты крывёй тратуар. Яе апанавала вялікая стома. Заплюшчваючы вочы, яна яшчэ адчула пах крыві.

Пераклад з польскай Настассі Галкоўскай

Сільвія Каліноўска: «Раблю тое… што люблю»

З таленавітай мастачкай Сільвіяй Каліноўскай (працы яе вядомыя чытачам «М» з ранейшых гасцяванняў на нашых старонках польскага часопіса «ПКК») не толькі пра яе зачараванасць мастацтвам размаўляў Іштван Грабоўскі.

— Маеце за плячыма добра прынятыя публікай выставы — мясцовыя і замежныя. Працы вашы падабаюцца людзям, абуджаюць у іх эмоцыі. Чым вы ганарыцеся?

— Мая творчасць прасякнута шматлікімі натхненнямі і назіраннямі, выкарыстанымі мною раней у якасці канвы. Малявала калісьці жахлівых стракоз, быццам выцінаных з эфірнай паэзіі Баляслава Лесьмяна. Спрабавала паглыбіцца ў надбужанскія травы і назіраць ашаламляльныя фарбы і ўзнёслыя хмары з пункту гледжання жабкі. Малявала коней, якія носяцца па лузе, і партрэты пажадлівых кабет у акружэнні птахаў, стракоз і буйнай расліннасці. Усё гэта рабілася спантанна і нязмушана. З прычыны выкарыстання розных матываў мне ўдалося стварыць уласны магічны свет, у якім адлюстраваны мае ўяўленні. Мяркую, гэта можа быць нагодай для гонару.

— Раскажыце, што для вас маляванне карцін? Гэта своеасаблівае хобі, ці слабасць, ці мо лад жыцця?

— Я здаўна марыла, каб захапленне маляваннем, паглынуўшы мяне без астатку, зрабілася ладам жыцця, прыносіла мне радасць і задавальненне. Упарта трымалася гэтай ідэі — і мары мае дачакаліся сваёй рэалізацыі. Ёсць у мяне прадчуванне, што раблю тое, што люблю. Акрамя таго, малюючы, я адпачываю. Задавальненне, якое атрымліваю дзякуючы сваім карцінам, забяспечвае мне і спакой, і ўсмешку, і матывацыю да новых работ. Каб не трапіць у руціну, займаюся яшчэ танцамі, фатаграфую, распрацоўваю дызайн керамікі і адзення. Гэтыя заняткі таксама натхняюць.

— Павернем час крыху назад. Калі вы адкрылі ў сабе здольнасць да эфектнага малявання?

— Не магу сказаць дакладна, калі ўва мне прачнулася ўсвядомленая прага да малявання. Першыя спробы заштрыхоўваць прастору былі заўважаны ў дзяцінстве. Бяздумна мазала па аркушы паперы, які толькі трапляўся пад руку. Часам гэта былі цікавыя спробы. Але я ніколі не задумвалася, што гэта можа стаць маім жыццёвым прызваннем. Бацылу жывапісу падхапіла толькі на мастацкіх пленэрах. Шмат яны мне далі. Малады чалавек часта заблытваецца ў перакананні, што ўсё, да чаго ён дакранаецца, цудоўнае. Толькі з цягам часу набіраеш дыстанцыю да сябе і сваіх стараннуў. Чым больш я малюю і ўдасканальваю сваё майстэрства, тым хутчэй прыходзіць упэўненасць, што я яшчэ не вельмі шмат умею. Таму залішнія амбіцыі ці зорная хвароба мне не пагражаюць.

— Дзе вы мелі магчымасць удасканальваць свае навыкі? Ці быў у вас настаўнік, які б мог падказаць, падштурхнуць, ацаніць першыя работы?

— З радасцю сцвярджаю, што на розных этапах жыцця сустракала шмат мудрых і годных людзей, якія мяне натхнялі. Шмат разоў падкрэслівала, наколькі я ім удзячная. У пачатковай школе маім правадыром у свет мастацтва быў Аркадыюш Маркевіч, бацька вядомай цяпер спявачкі Малгосі. Ён навучыў мяне ствараць калажы і «прышчапіў» ахвоту да малявання. Падчас вывучэння гісторыі мастацтва мела прыемнасць знаёмства з прафесарам Марыяй Ганнай Сасноўскай, цудоўнай апавядальніцай пра творы жывапісу. Дзякуючы заняткам з Олафам Квапісем, даследчыкам сярэднявечнага італьянскага мастацтва, зрабіла натхняльныя мастацкія вандроўкі ў Італію, значна пашырыўшы ўласныя ўяўленні. На факультэце жывапісу ва Універсітэце Марыі Кюры-Складоўскай вучылася пад наглядам прафесара Яцка Вайцяхоўскага, што абудзіў ува мне свядомасць мастачкі і прафесійную шчырасць. Дзякуючы Лешку Сакалоўскаму чатыры разы ўдзельнічала ў мастацкіх пленэрах, арганізаваных у «Вясёлкавым фальварку» ў Крымошыцах. Пазнаёмілася там з вельмі цікавымі людзьмі. Назіранне за іх стылем, штрыхамі, майстэрствам стала для мяне каштоўным досведам. Цяпер магу сцвярджаць, што сімпатызую людзям незвычайным, якія выклікаюць павагу сваімі ведамі і дасведчанасцю.

— Калі маляваць для вас было так важна, навошта вы пераарыентаваліся на вывучэнне біялогіі? Не шкада было часу? Пазней жа яшчэ выбралі гісторыю мастацтва і навучанне графіцы…

— Не лічу, што за вывучэннем біялогіі губляла час. У юнацтве не магла ведаць дакладна, чаго прагне душа і да чаго насамрэч імкнуся. Біялогію выбрала, бо люблю прыроду і была пераканана, што здолею сябе ў гэтым знайсці. Аднак малявала ўвесь час і ўжо падчас навучання дачакалася першай выставы «Дзея ў квадраце», арганізаванай у Галандыі. Усвядоміла тады, што варта ісці гэтым шляхам. З таго часу мая адукацыя працягвалася ў Callegium Civitas і Універсітэце Марыі Кюры-Складоўскай.

— Якія майстры пэндзля абуджалі вашы ўяўленні ў юнацтве? Ці пакінулі іх работы трывалы след у вашых незалежных дасягненнях?

— У юнацтве я прагна чытала біяграфіі мастакоў. Некаторыя з іх далі мне значна больш, чым проста ўрокі. Агонь і жарсць ацаніла ў фантастычных выявах Фрыды Кала. Праз яе колеры Мексіка выглядала неўтаймоўна дзікай і таямнічай. Вялікае ўражанне зрабілі работы Пабла Пікаса… і не толькі тое, што названа кубізмам. Свае ўражанні Пікаса чэрпаў з жыцця, а гэта рабіла яго мастацтва сапраўдным. Вельмі мне даспадобы яскравая творчасць Густава Клімта, вельмі захапляюць работы Караваджы і Сальвадора Далі. Як бачыце, мела перад сабою шмат паказальных прыкладаў. Увогуле, адчуваю сябе толькі ў пачатку дарогі і ўвесь час шукаю нешта, што здолее мяне ўзбагаціць.

— Вашы прыгоды з мастацтвам пачыналіся ад коней, якіх вы рысавалі тушшу і малявалі пастэллю. Ці адыграла тут нейкую ролю блізкасць яноўскай стайні?

— У мяне такое адчуванне, што ўсё, чым мы ў юнацтве насычваемся, аддаецца пазней з працэнтамі. Маё маляванне як некалі было, так і цяпер ёсць вельмі блізкае да прыроды. Я вырасла сярод надбужанскіх палеткаў, дзе магла ўдосталь налюбавацца прыгажосцю арабскіх скакуноў. Малявала, як яны блукаюць у травах, ці ў руху — з развеянымі грывамі, са шпаркімі капытамі. Марылася злавіць гэта хараство вокам Сільвіі.

— А вядомай вы сталі з-за сваіх незвычайных карцін. Што прымусіла ствараць іх на дошках, ды яшчэ з разабраных дамоў? Было гэта формай пратэсту ці жаданнем знайсці новыя сродкі самавыяўлення?

— Гэта праўда — я шукала новыя сродкі самавыяўлення. Палатно мяне абмяжоўвала як плоская паверхня, затое жывапіс па дрэве даваў новы досвед. Адкрыла ў сабе любоў да малявання па драўніне, якая пацярпела ад часу і моцы прыроды. Няроўнасці ў фактуры дыктавалі мне наўпрост, як павінен выглядаць партрэт асобы. Малюючы на дошках «анёліц», давала гэтым дошкам другое

жыццё. Стварала нават цэлыя тэматычныя цыклы, у якіх яны адно з адным перагукаліся. Цешуся, што вартасць маіх карцін на дрэве зразумеў і ацаніў Гжэгаж Міхалоўскі, галоўны рэдактар «ПКК».

— Квартальнік вельмі дапамог вашаму руху наперад.

— Так, вельмі. Мае карціны трапілі на вокладкі часопіса, а на яго старонках размясціліся добразычлівыя рэцэнзіі на мае выставы. Пры дапамозе Гжэгажа Міхалоўскага Публічная бібліятэка ў Бяла-Падлясцы і Таварыства Сяброў Падляшша выдалі прыгожы альбом пад назвай «Коні… анёліцы і надбужанскія палеткі». Прынялі яго вельмі прыязна, а некаторыя мае прыхільнікі змяшчалі рэпрадукцыі ў аправы, каб павесіць у сваіх кватэрах. Гэта было вельмі міла.

— Ваша творчасць адкрывае шмат узаемавыключнага — ад далікатнасці да драпежнасці. Як думаеце, такая перамена настрояў выклікае больш ахвоты да працы, пазбаўляе руціны, якой мастак павінен асцерагацца?

— Мая творчасць эмацыйная: усё, што мяне датычыцца, адбіваецца ў маіх работах. Безумоўна, з гэтай прычыны некаторыя карціны літаральна кіпяць эмоцыямі. Гэта бачна ў прыадкрытых вуснах жанчын, доўгіх шыях, злёгку прыкрытых вачах. Карціны затуляюць прастору і прыадкрываюць кавалак свету, пакінуты самому сабе. Што можа быць больш захапляльным?

— Гледзячы на вашы работы, задумваешся, чаму яны апанаваны тварамі і сілуэтамі прыгожых жанчын? Гледача павінна ўразіць хараство і пачуццёвасць?

— Ахвотней за ўсё я малюю тое, што мне падабаецца. Мо калі-небудзь, калі торкне мяне стыло часу, зменяцца твары маіх гераінь. Часта мне даводзіцца ствараць партрэты. Паколькі не прызнаю звышрэалізму, мусяць яны быць узбагачанымі дадатковымі элементамі кшталту мяккасці або недаказанасці.

— Затрымаемся крыху на вашых знакамітых «анёліцах», вытанчаных і напоўненых пачуццёвай сілай. Ці імпануюць вам асобы, упэўненыя ў сабе, гатовыя змагацца з нягодамі?

— Натуральна, што мне імпануюць кабеты адважныя і рашучыя. Трэба аднак памятаць, што моцная жанчына ахвотна адказвае на новыя выклікі часу, шукае невядомыя дагэтуль магчымасці, яна ўся адкрыта невядомаму, неўсвядомленаму. І гэта, відаць, соль майго жыцця. Ствараючы пачуццёвыя карціны, я выяўляю сябе, сваю сутнасць.

— Ці здолелі вы адкрыць таямніцу жаночай прыроды?

— Пагадзіцеся, што гэта досыць працяглы і складаны працэс, улічваючы хаця б такі факт, што жанчына па сваёй прыродзе пераменлівая. У юнацкія гады яна не такая, як у час мацярынства ці ў веку сталым. Думаю, што на гэтую тэму магла б расказаць больш, калі б была сівавалосай бабулькай.

— Вашы інтрыгуючыя работы пульсуюць жыццём надбужанскай прыроды. Дзе вы знаходзіце новыя натхненні, як сілкуеце свае батарэйкі?

— Як ужо згадвала, я натхнялася колерам, смакам і пахам надбужанскага краявіду. Творчыя батарэйкі падзараджаю падчас далёкіх ванд-

ровак. Сцвердзілася ў думцы, што кожная вандроўка можа быць адкрыццём, нагодай для спасціжэння сябе, набірання дыстанцыі да жыцця, якое сплывае. Таму так цудоўна выязджаць і потым вяртацца ў свой куток.

— Калі ўжо размаўляем пра вандроўкі, дзе б вы знайшлі для сябе ідэальнае месца?

— Яно не мае пастаянных каардынат. Знаходзіла б яго там, дзе лінія гарызонту сутыкаецца з чыстым пяском і цёплай вадой. Такое месца асацыіруецца ў маім уяўленні з вельмі зычлівымі людзьмі, якія знаходзяцца ў пошуку жыццёвай гармоніі.

— А з чым у вас асацыіруецца поспех?

— Тут няма ў мяне ніякіх сумненняў. Поспех — гэта магчымасць злучыць творчы запал з працай, якая абуджае ў людзях пазітыўныя эмоцыі. Мерай поспеху, калі разумець яго так, з'яўляецца жыццё на ўласных умовах.

— Ці здолелі вы да яго наблізіцца?

— Маім асабістым поспехам з'яўляецца набыццё месца для творчасці, якая не мае перашкод, і рэалізацыі ўсіх памкненняў. Дзякуючы мастацтву, якому служу, я не губляю радасці жыцця. Рэалізуюся ў тым, што раблю.

— Што дае вам штодзённыя радасці, а што раздражняе?

— Прыемнасць мне ствараюць цікавыя падарожжы, эстэтычныя ўражанні, сяброўскія размовы з зычлівымі людзьмі, радасць майго дзіцяці і жоравы ў небе. Раздражняе мяне нахабная ўсмешка на твары чалавека, які свядома чыніць зло.

— Ці можа жывапіс, якому вы сябе прысвяцілі, быць спосабам пражыць жыццё цікава?

— Я пераканана, што так, хоць мастак мусіць моцна старацца, каб не загразнуць

у руціне і пазбегнуць псіхічных праблем. Уласна кажучы, дзеля гэтага варта не атачаць сябе таксічнымі людзьмі. Быць рэалізаваным — цудоўны спосаб цікава жыць.

— Вы маладая, прыгожая, поўная энтузіязму жанчына. Як уяўляеце сябе гадоў праз дваццаць?

— Яшчэ пра гэта не думала. Мабыць, не ўяўляю сабе іншага жыцця акрамя таго, якім цяпер жыву. Але думаю пра наступныя творчыя ўзлёты. Я — за актыўнае жыццё. Лічу, што буду яго мець, хоць шчасцю трэба крочыць насустрач.

Пераклад з польскай Святланы Воцінавай